Przesyłka opłacona ryczałtem.

№ 31 Нядзеля, 5-га Кастрычніка 1924 г. Год I.

ГРАМАДЗКІ ГОЛАС

Выходзіць тры разы ў тыдзень. Цана нумару 15 грошай.

Падпісная цана на 1 месяц 1 злоты 80 гр. За граніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Людвісарская вул. дом № 4. (Wilno, Ludwisarska 4). Рэдакцыя адчынена ад 10—2 гадз. Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. удзень, апрача сьвятаў.

Цана абвестак за радок пэтыту: на 1 стар. — 15 гр. у тэксьце — 10 гр. на апошн. стар. — 5 гр.

АБВЕСТКА.

Ад часу арганізаваньня Часовай Беларускай Рады ўся палітычная праца, якую пачало Беларускае Грамадзянскае Сабраньне, перайшла да **Часовай Беларускай Рады.**

Усе настаўнікі, якія маюць раэстравацца, павінны высылаць анкеты ў **Школьную Камісію** пры Часовай Беларускай Радзе, Вільня, Людвісарская вул. 4.

Часовая Белар. Рада.

Ці тое патрэбна?

Сталічныя газэты паведамілі з саўсім верных крыніцаў аб праектаваньні ўрадам увядзеньня ў Палесьсі вынятковага палажэньня дзеля таго, каб лягчэй можна было спаралізаваць праявы бандытызму.

Лявіцовая польская прэса саўсім дарэчы зазначае, што вельмі выразна акрэсьлена ў Дзяржаўнай Конституцыі, калі вынятковае палажэньне можа ўводзіцца і што нічога, тымчасам, на Палесьсі няма гэткага, што можна было-б разумець, як адпаведны момэнт, вымагаючы прытарнаваньня там конституцыйнага артыкулу аб вынятковым палажэньні.

Праўда, адваго бандытаў, напаўшых апошнім час на поезд пад Луніцом, перайшла ўсякія межы, але-ж з гэтага яшчэ не вынікаюць гэтак далёкія пасьледзтвы, каб узаконіць хаця-бы на некі час нейкае асобнае палажэньне для Палесься.

Фактычна гэты край нашае зямлі і так шмат пеі ажыў турботаў цры прасьледаваньні бандытаў „атамана" Каліненкі, і вельмі зразумелая рэч, што ад гэта ўхіліцца нельга было.

Проці бандытаў фактычна, як і належыць, ужываюцца ўсе вострыя меры, якія мае ў сваім распараджэньні дзяржаўна-адміністрацыйны апарат.

Вынятковае палажэньне толькі магло-б залішне абмежаваць тое насяленьне, якое ніякага дачыненьня да дывэрсыйных нападаў ня мае і якое, ў рэзультаце ўсяго, само найболей церпіць ад ненармальнага зьявішча ў вакрузе яго пражываньня.

Калі, напраўду, сярод насяленьня й ёсьць пэўнае спачуваньне нейкім самазваным, хоць-бы сабе й беларускім ці украінскім, „атаманам", дык кожнаму робіцца зразумелым, што аднымі паліцэйскімі мерамі дасягнуць патрэбнага спакою трудна, а навет і немагчыма, якога-б вынятковага характару гэтыя меры ні былі.

Справа ясная, што трэба ў карані лячыць хваробу, трэба зьвясьці на ноль самую магчымасьць таго, каб нехта, жывучы ў Польшчы, спачуваў заграні чным ці сваім, тутэйшым бандытам.

І аб гэтым таксама кажуць лявіцовыя польскія газэты.

У „Robotniku", напрыклад, вядомы польскі публіцысты Тадэуш Голувко проста піша, што *„польскі ўрад павінен імкнуць да паразуменьня з беларусамі й украінцамі і, як старана больш дужая, павінен зрабіць першы крок у гэтым кірунку".*

Падкрэсьліваючы гэтыя, сапраўды цьвярозыя, словы аднаго з найвыдатнейшых у Польшчы публіцыстых, мы зусім даўно згаджаемся з яго цьвярджэньнем, што цяпер надыйшоў гэткі момэнт, калі „сапраўды патрыятычныя й дэмакратычныя элементы сярод беларускіх і украінскіх грамадзкіх дзеячоў павінны падыйсьці да перагляду свае тактыкі ў адносінах да Польскае Дзяржавы".

А дзяржаўная ўлада, як правільна зазначае вышэйназваны прадстаўнік соцыялістычнага польскага руху, павінен „прыцягнуць мясцовую украінскую й беларускую інтэлігэнцыю да супрацоўніцтва ў дзяржаўнай рабоце".

Дэлегацыя Беларускага Пасольскага Клюбу, як відаць, даючы адбой дасюлешняй тактыцы нашых пасло ў Сойме, была ўжо ў прэм'ера п. Ул. Грабскага. Праўда неяк дзіўна, што нашыя паслы ў Сойме казалі адно, а ў кабінэце прэм'ер-міністра сьпяваюць другое, але гэта ўжо справа іхняе палітычнае граматнасьці.

Бязумоўна, толькі рэальная рэформы ў нашым краі загарантуюць іншае, спакойнае жыцьцё ў нашых кутках і толькі энэргія ўсяго тутэйшага насяленьня, скіраваная проці дывэрсыйных праяваў, можа палажыць канец таму, што, нажаль, здараецца.

І канец гэтаму можа быць паложаны блізка што бяз ніякага болю, бяз лішняга самаабмежаваньня.

Ёсьць яшчэ, праўда, гарачыя галовы ў польскім грамадзянстве, якія, як прыкладам, пястаўскае «Echo Warszawskie», перад аднаго з сваіх корэспондэнтаў дадумаліся да адзінага спосабу „пераламіць бандытаў асабліва тых, якія набіраліся з мясцовага насяленьня... *арыштам* усіх солтысаў і войтаў суседніх (з месцам лунінецкага нападу) валасьцяў і пратрыманьнем да таго часу, пакуль ня будзе выкрыта хаця-б некалькі вінаватых, пасьля чаго па нітцы ўжо лёгка будзе дайсьці да клубка".

Гэткая форма *закладніцтва* ў бар цьбе з бандытызмам толькі й можа быць выказана журналістым, які, відаць, мае прэтэнсію выказаць іншыя, як вострасьць яго пяра, здольнасьці.

Ніхто падобнай думкі сур'ёзна трактаваць ня можа, ніхто ня можа згадзіцца з тым, каб на шляху абураньня пі ў чым невінаватае большасьці сельскага насяленьня даходзіць да крайнасьці.

Калі нездаволеньне цяперашнім парадкам рэчаў у нашым краі сярод пэўнай часьці беларускага насяленьня й ёсьць, дык абапёрта яно на пэўных таксама палітычных прычынах.

Але першы рэальны крок на шляху выкараненьня раз назаўсёды падобных прычынаў нездаволеньня, на шляху палітычных, адміністрацыйных і эканамічных рэформаў — *бязумоўна найлепшы спосаб* да зьнішчэньня й самага ўспаміну аб сягоньняшніх ненармальнасьцях у будучыне.

І ня тое якраз патрэбна і ў Палесьсі і на ўсёй Заходняй Беларусі, аб чым думае ўрад ды пястаўскія нацыяналістычныя корэспондэнты.

Тут патрэбны не вынятковыя палажэньні, не абмежаваньні спакойнага жыхарства і не пястаўскае закладніцтва, матар'ялам для якога маглі-б служыць войты ды солтысы, — а толькі фактычнае правядзеньне рэформаў, аб якіх і мы няраз пісалі дый болей разумная польская прэса гаворыць часта.

Палітычны агляд.

Палажэньне ў Арабіі.

Ад нейкага часу тэлеграф прыносіць весткі, што ў Арабіі Ваґабіты ўдачна наступаюць на Гэджас і што Мэка, сталіца караля Гэджасу, Гусэйна, хутка паддасцца. Хто-ж гэта Вагабіты ды хто такі кароль гэджаскі Гусэйн? Вагабіцкае арабскае племя займае цэнтральную частку Арабійскага паўвострава, дзе ўтварылася каралеўства Нэджы. Вагабіцкае племя яшчэ ад 18 сталецьця змагаецца з ісламам. Быў час, калі яно захвацiла і валадала сьвятыняй мусульман Мэкай. Пасьля Туркі йзноў выперлі Вагабітаў у глыб Арабіі. Гэтак цягнулася да 1914 г. У гэтым часе Вагабіты йзноў пачалі энэргічнае змаганьне з Турцыяй і навет захвацілі гор Газу. У той час якраз пачалася сусьветная вайна і Англія пастанавіла ўмяшацца ў гэту барацьбу, каб вызваліць і захваціць некаторыя кускі на бліжэйшым усходзе, якія ўжо даўно зьвярталі на сябе яе ўвагу. Англія грашавымі падмогамі падтрымоўвала Вагабітаў разам з суседнім племем Шамарам, каб яны далей вялі вайну з Турцыяй. Але Вагабітаў разьбілі, і ангельцы ад іх адвярнуліся. У той-жа час ангельская ўлада ў Эгіпце падтрымала шэрыфа Мэкі Гусэйна, якога пасьля ангельцы прызналі каралём Гэджасу, провінцыі, якая даходзіць да Чырвонага мора, а сыноў яго назначылі каралямі Заіордана і Мэсопотаміі. Кароль Нэджы Сауд палічыў сябе пакрыўджаным і пачаў вайну з Гусэйнам. Ангельцы, каб спыніць гэта, запрапанавалі яму грошы — 5.000 фунт. штэрлінгаў штомесяц. Але ў апошні час няма ведама чаму спынілі гэту субсыдыю, пасьля чаго кароль Вагабітаў Сауд пачаў вайну з Гэджасам. Колькі месяцаў назад Вагабіты напалі на Палястыну і Мэсопотамію, але былі адбіты ангельскімі войскамі пры помачы аэропланаў. Тады яны перамянілі фронт і галоўны ўдар скіравалі проці Гусэйна, якога ня могуць падтрымаць ангельскія войскі. Апрач таго Гусэйн не карыстаецца популярнасьцю сярод магамэтанскага насяленьня і яго ўсе называюць ангельскім наёмнікам і здраднікам мусульманскага руху. Дзеля гэтага, шансы Гусэйна вельмі слабыя. А няўдача Гусэйна можа шкодна адбіцца і на Мэсопотаміі з Мосулем, дзе пануець яго сын і дзе гэткі-ж конфлікт пачаўся з Турцыяй.

N.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Згодна з пастановаю сэньёрэн-конвэнту першае пленарнае паседжаньне Сойму, пасьля летніх вакацыяў, адбудзецца 21-га кастрычніка. Паседжаньні камісіяў пачнуцца 14. X. Сойм адразу займецца першым чытаньнем бюджэтнага прэлімінара на 1925 год.

Рэзультатам конфэрэнцыі соймавае групы пасла Брыля і групы „Wyzwolenia" было пагоджаньне праграмы і тактыкі ў соймавых працах. Прынята пастанова трымаць у будучыне цесны контакт.

Пасол Рэйх (кола жыд.) зьвярнуўся да Маршалка Сойму з просьбай аб перанясеньні сроку першага па вакацыях паседжаньня Сойму на 22 гэтага кастрычніка, дзеля таго, што 21-га выпадае жыдоўскае сьвята. П. Маршалак дакляраваў узяць гэту просьбу пад увагу і срок паседжаньня Сойму пэўна што будзе перанесены.

На вялікім мітынгу ў Холме партыі „Пяста" была прынята рэзалюцыя, якая прапануе паслом „Пяста" дапамагаць хутчэйшаму павароту на ваенную службу маршалка Я. Пілсудскага.

„Kurjer Polski" паведамляе, што ў сувязі з апошнімі падзеямі на акраінах, урад стараецца магчыма хутчэй стварыць дзяржаўны сэкрэтарыят па справах акраін.

2-га гэтага кастрычніка абвешчана выканаўчае распараджэньне ўраду аб **урадовай мове** ў адміністрацыі і самаўрадах.

Прэм'ер-міністар п. Ул. Грабскі прыняў 2-Х дэлегацыю Беларускага Пасольскага Клюбу на чале з кс. Станкевічам. Дэлегацыя падала рад постулятаў датычна правядзеньня ў жыцьцё языковых законаў. Дэлегацыя падкрэсьліла свае якнайлепшыя адносіны да дзяржавы і замераў ураду ў кірунку ўрэгуляваньня справы нацыянальных меншасьцяў.

Палескім ваяводаю мае быць назначаны палкоўнік Млодзяноўскі, камандзер Школы Падхарунжых.

„Robotnik" перадае з афіцыяльных сфэраў, што, пасьля колькідзенных нарадаў, урад адкінуў думку аб увядзеньні на ўсходнім паграніччы выняткавага палажэньня, лічачы, што іншых, прынятых ім, мераў хапае дзеля запэўненьня бясьпекі ўва ўсходніх ваяводзтвах.

З украінскіх кругоў пярэчаць вестцы нібыто Украінцы мелі згадзіцца на тварэньне іхняга Унівэрсытэту ў Станіславове. Украінцы й далей будуць абстойваць патрэбу унівэрсытэту ў Львове.

На будучым тыдні ваенны міністар гэн. Сікорскі выяжджае ў Парыж.

За граніцай.

У Баўгарыі рэвалюцыйны камітэт пачаў арганізацыю ваенных аддзелаў. Як паведамляюць „Бѣлградскія Новости", баўгарскі ўрад трымае сталічны сафійскі гарнізон напагатове.

Ангельскі міністар заграгічных спр. Понсобі, адказваючы ў парлямэнце на запрос, заявіў, што ўрад **Англіі** прызнае ўладу **маскоўскага** ўраду над **Грузіяй**, дзеля гэтага ён лічыць цяперашняе палажэньне там унутраным палітычнаю справаю С. С. Р. Р.

Весткі, якія даходзяць з **Мэкі**, пярэчаць адна адной. Пацьвярджаецца толькі, што кожны, хто мог, уцёк у Дзьеддах. **У Мэццы** застаўся толькі кароль Гусэйн са сваею сьвітаю ды калекі.

Паводлуг афіцыяльных **гішпанскіх** паведамленьняў з **Мароко**, непрыяцель прабаваў 1-га кастр. перарваць камунікацыю паміж Тэтуанам і Шэшуанам, аднак-жа, пасьля заўзятае спатычкі, быў адбіты і пакінуў на полі бою 123 забітых і шмат трофэяў. Цяпер дарога Тэтуан — Шэшуан саўсім свабодна.

„N. Fr. Pr." паведамляе з **Софіі**, што 2-Х там застрэлены македонец Васільеў, а 3-Х увечары каля вакзалу забіты баўгарын Тупараў. Каля Мэрыні забіты пасол-камуністы д-р Максімаў.

Некаторыя ангельскія газэты пішуць навет аб магчымасьці упадку кабінэту Макдональда. Сход лібэральнае партыі пастанавіў падтрымаць прапазыцыю консэрватараў аб недаверы ўраду; далей на гэтым сходзе пастаноўлена ўнясьці прапазыцыю аб магчымасьці ратыфікацыі англа-савецкага дагавору пры варунку адмовы саветам у пазычцы.

Паводлуг паведамленьня з Канстантынопаля за 3 кастрычн., ў Сванэтыі (**Грузія**) ўзяты паўстанцамі ў палон вялікі аддзел чырвонае арміі. Чугуначная лінія Тыфліс—Батум перарвана. Нэфтапровад Баку — Батум падарваны. Сілы паўстанцаў павялічваюцца. Савецкі флёт увесь час перавозіць войска ў **Грузію**.

Паміж Паўночна - Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі і Англіяй дасягнена паразуменьне аб пазычцы для **Нямеччыны**.

У Нямеччыне адбылася нарада канцлера з лідэрамі палітычных партыяў па пытаньню аб расшырэньні асновы кабінэту. Згадзіліся з замерам канцлера ўвайсьці ў перагаворы з нацыяналістычнымі і соц.-дэмакратычнымі партыямі. Мэтай аб'яднаньня будзе правядзеньне ў жыцьцё Лёнданскага трактату.

Французская рада міністраў пастанавіла даць агульны **франка-англа-бэльгійскі** адказ на ноту **Нямеччыны** з варункамі ўваходу яе ў Лігі Народаў.

Будынак быўшага расейскага пасольства ў **Лёндане** пераданы прадстаўніцтву савецкага ўраду. Займаўшыя дасюль будынак уцекачоўскія арганізацыі забралі значную часьць пасольскага архіву.

Гэтымі днямі **Літоўская** палітычная паліцыя зрабіла некалькі вобыскаў у асобаў, западозраных у антыдзяржаўнай дзейнасьці ў Шаўлях і Мажэйках. Выкрыта камуністычная літэратура, корэспондэнцыя з расейскімі камуністымі і іншы матар'ял. У Шаўлях арыштована 12 чалавек, у Мажэйках — 7, сярод якіх пераважаюць жыды.

З **Рэвалю** паведамляюць, што ў петраградзкім ваенным трыбунале пачаўся процэс быўшага сэкрэтара эстонскага консульства ў Петраградзе Ротфэльда. Ня гледзячы на неадназовыя протэсты эстонскага ўраду, Ротфэльд шэсьць месяцаў прасядзеў у вастрозе, а цяпер яго абвінавачваюць бальшавікі ў шпіёнстве на карысьць Эстоніі.

З Харбіну даходзяць весткі, што быўшы камандзер белых войск у Сыбіры **гэн. Болдыраў** назначаны сябром ваенна-рэвалюцыйнае рады пры галоўным камандзеры войскаў Прыморскае і Усурыйскае абласьцяў і прэзэсам камісіі па абароне Далёкага Усходу.

З **Жэнэвы** тэлеграфуюць, што пратакол па пытаньню аб арбітражы і бясьпечнасьці аднагалосна прыняты 47 дэлегацыямі, якія бяруць удзел у сабраньні Лігі Народаў.

У Кітайшчыне ўсё яшчэ йдзе хатняя вайна. «United Presse» паведамляе, што, пасьля заўзятых трохдзенных баёў за **Шанхай**, абаронцы ўтрымалі свае пазыцыі. Атакі манджурскіх войскаў чакаюць у пачатку чароднага тыдня.

З Лёндану паведамляюць, што галава вызваленчага руху ў Індыі Ганді, які пасьціў 21 дзень, захварэў ад голаду.

Камуністычная фракцыя ляндтагу ў **Баварыі** ўнясла прапазыцыю аб незабаўным роспуску канцылярыі быўш. вялікага князя Кірылы ў Кобургу. Камуністыя дабіваюцца выгнаньня самазванага цара за граніцу.

Агляд прэсы.

Морэль аб Польшчы.

У мінулым месяцы прыехаў ў Польшчу дэпутат ангельскага парлямэнту, адзін з выдатнейшых сяброў рабочай партыі і асабісты прыяцель Макдональда, п. Морэль, які ў канцы верасьня быў і ў Вільні, дзе знаёміўся з тутэйшымі праявамі грамадзкага жыцьця. Цяпер варшаўскі „Robotnik" друкуе гутарку свайго корэспондэнта з ангельскім палітыкам.

Аб жальбах нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, Морэль кажа, што яны маюць повады скардзіцца.

Я думаю, — кажа, — што іхнія жальбы маюць рэальную падставу і што патрэбны шырокія адміністрацыйныя рэформы, асабліва ўва ўсхо-

R. U. S.

Праўда і няпраўда ў камунізьме.

(Глядзі № 30 „Грам. Голасу").

Камуністыя кажуць, што да гэткага разьдзелу ня будзе дапушчана, калі ўласьнікам зямлі будзе дзяржава. А мы кажам, што гэтак ня будзе. Дзяржава будзе гвалтам адрываць сялян ад зямлі і рабіць з іх рабочых або назначаць іх да іншай працы. Гэта будзе жандарская дзяржава, а ня воля і свабода. Вырашаць зямельнае пытаньне трэба зусім інакш. Цяпер гэта найлепшы спосаб, калі найстарэйшы сын, які застаецца на ральлі, пасьля сьмерці свайго бацькі, з даходаў з гэтай ральлі выплачвае сваім братом, дзеля таго карыстацца спадчынай усе, хто працаваў на ральлі разам з бацькай, маюць права, дык і справядліва, каб усе карысталіся з яе даходаў. Гэткім чынам кожны, каму прыдзецца пакінуць зямлю, мае за што зачапіць рукі ды працаваць пры іншай рабоце. І ён можа карыстацца рэзультатамі свае працы, бо інакш - дык гэта будзе камуністычнай гаспадаркай, якой не прызнаецца спадчына, дык дзеці, пасьля сьмерці свайго бацькі ня могуць карыстацца рэзультатамі яго цяжкой працы.

У канцы яшчэ адна ўвага. Дзе знойдзеце селяніна, які дабравольна адрокся-б ад зямлі, даста ўшайся яму ў спадчыне па бацьках? Гэткага выпадка трэба са сьвечкай шукаць. А вось гэтага камуністыя дамагаюцца ад сялян.

У час вайны пад градам куляў, у склепах і зямлянках, у бядзе і галадзе, трымаўся аднак селянін свае зямлі і хаты. Сваей крывёй баранiў яе і крывёй купляў права быць гаспадаром на ёй. Адабраць ад яго гэту зямлю, якую ён палюбіў больш за ўсё, — гэта дзікасьць, якую могуць зрабіць толькі людзі бяз ніякага сумленьня. І дзеля гэтага сяляне павінны вон гнаць камуністых, бо гэта найвялікшыя іхнія ворагі.

III.

Камунізм і рабочыя.

Паводле камуністычных і социялістычных пісьменьнікаў, сьвет толькі тады пераменіцца, як рабочыя возьмуць у свае рукі ўладу і тады ня будзе ўжо больш пакрыўджаных і крыўдзіцеляў. Асновай грамадзкай і палітычнай арганізацыі павінен быць пролетарыят, які ўсё возьме ў свае рукі. Паводле думкі камуністых, цяперашні капіталістычны грамадзкі лад ёсьць абапёрты на крыўдзе. Рабочыя павінны зрабіцца ўласьнікамі прыладаў працы, якія цяпер належаць да капіталістага, павінны адтрымаць плату за поўную вартасьць свае працы.

Дык вось камуністыя, згодна з гэтымі прынцыпамі, як толькі ў Расеі дарваліся да ўлады, ўсе фабрыкі і варстаты працы зрабілі грамадзкаю ўласнасьцю. Адабралі іх ад іхніх праўдзіных гаспадароў і аддалі дзяржаве ды загадалі, каб імі кіравалі работніцкія камітэты. Рэзультат гэтых загадаў быў страшэнны. Усё прамысловае жыцьцё замёрла — тысячы рабочых апынуліся бяз працы і голад з бядой заглянуў ў работніцкія хаты.

Камуністычная арганізацыя працы замест таго, каб ушчасьлівіць рабочага, аддала яго ў рукі дзяржаве-жандару, якая ня толькі пазбавіла яго працы, але проста магчымасьці жыць. Хто не захацеў сьлепа прысягаць на веру бальшавіком, той траціў хлеб, як белагвардзеец або контр-рэвалюцыянэр, калі, дзякуючы шырока разьвернепай шпіёнскай сыстэме, не пападаў пад сьцену на расстрэл.

Замест профэсыянальных кіраўнікоў варстатамі працы, прыйшлі, галоўным чынам, людзі не профэсыяналы, выбраныя бальшавіцкімі работніцкімі камітэтамі, якія ня ўмелі кіраваць працай. Замест таго, каб падняць прамысловасьць у Расеі, камунізм зьнішчожыў яе ўшчэнт.

дняй Галічыне. Хто кажа, што украінскі рух ува ўсходняй Галічыне выклікаваны расейскай пропагандай, той не прызнае гістарычных фактаў, а таксама й варункаў цяперашняго моманту, якія даступны кожнаму інтэлігэнтнаму чалавеку.

Пасьля, сказаўшы колькі компліментаў на тэму віленскага унівэрсытэту, касы хворых і інш. бачаных ім установаў, п. Морэль ізноў варочаецца да балючай справы нацыянальных меншасьцяў.

З усіх справаў, датычна нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, найважнейшая і самая сьпешная, паводле мае думкі, справа украінцаў у Галічыне Усходняй, — але лепш ня буду казаць аб шырокіх пытаньнях датычна мясцовай аўтаноміі, аб якіх гаворыцца публічна і якімі трэ' будзе раней ці пазьней заняцца...

Што датычыцца вонкавых справаў Польшчы, дык скажу адно: паводле мяне, няма ў Эўропе краю, якому больш былі-б патрэбны сталыя варункі міру, бо ніводзін край не мае гэтакай небясьпекі са стратэгічнага боку. Ня трэба быць спэцыялістам, каб сьцяміць, што для краю, які на 27 мільёнаў жыхароў мае $8^1/_2$ мільёнаў не-палякоў, для краю ўпёртага між двох магутных суседаў, з усходняй граніцай, якая цягнецца праз тэрыторыі з мяшаным насяленьнем,—для гэткага краю адзінай парукай сталай бясьпечнасьці ёсьць мір, абапёрты на арбітражы, агульным абязброеньні і абхопліваючай усіх дэмакратычна сфармаванай Лізе Народаў. Гісторыя Польшчы пакінула глыбокія раны і глыбока ўкаранёўшуюся няпрыязьнь у польскай нацыянальнай сьвядомасьці. Вычыркнуць іх—гэта ёсьць толькі пытаньне часу, але ў напрамку загаеньня гэтых ранаў і зьмягчэньня гэтых няпрыязьняў у Польшчы, як і ўсюды, павінна быць скіравана сіла дэмакратычнай думкі. На гэтым абапёрта ўсюды міжнародная роля работніцкага і соцыялістычнага руху. Нацыянальная бясьпека можа быць дасягнена толькі міжнароднай бясьпекай. Іншага шляху няма!

Рэха нападу на поезд

Напад і грабежства поезду пад Лунінцом доўга мусіць яшчэ не сайдзе са шпальтаў польскіх газэтаў. І няма дзіва. Апошні „дэбют" дывэрсыйных бандаў быў гэтулькі сьмелы, а палажэньне, ў якім апынуліся дыгнітары, ехаўшыя ў няшчасным поезьдзе, гэтулькі трагі-камічнае, што гэты факт балюча адклікнўся ўва ўсім польскім грамадзянстве.

Супрацоўнік газэты „Kurjer Polski" гутарыў на гэту тэму з вярнуўшымся з інспэкцыйнай падарожы на ўсходнія *крэсы* міністрам унутраных справаў п. Гюбнэрам, які між інш. сказаў:

Буду дамагацца строгага расьсьледаваньня справы павядзеньня жалезна-дарожніцкае ўлады ў часе нападу. Машыністы цягніка, які вёз біскупа і ваяводу, ўжо арыштаваны. Шмат дзіўных рэчаў дзеялася ў гэтай дырэкцыі. Далей, што датычыцца камэнданта Мянсовіча, дык ён зараз жа пасьля лунінецкага здарэньня быў устрымавы ў сваёй дзеяльнасьці. Камэндант паліцыі, які не бароніцца, але без барацьбы паддаецца, які не бароніць свайго ваяводы, гэта, шчыра кажучы — скандал.

Пагоня за бандытамі вельмі трудная. Лес, з каторага бандыты напалі на поезд, вялізны; ён цягнецца ад Баранавіцкага і Нясьвіскага паветаў. Гэтым лесам бандыты падыйшлі да чугункі нікім нябачаныя. Адыход маюць, ня гледзячы на ўсё, гэтак сама лёгкі. Банда Каліненкі разьбілася на дробныя гурткі. Павадыры і тыя, каму хацелася, лёгка перабраліся ў Расею, а ўчасьнікі нападу, якія жывуць у Польшчы, лёгка маглі схаваць аружжа і схавацца ў хатах. Паліцэйскія апавешчаньні кажуць нешта іншае, але я, як быўшы пракурор, на гэтыя справы гляджу з нейкім недаверыем.

— Кажуць, што ўжо колькі чалавек з банды злавілі,—сказаў супрацоўнік „К. Р.".

— Ведаю гэта, — адказаў міністар, — я толькі кажу, што тэрыторыя вельмі дрэнная. Лясы і балоты цягнуцца на сотні кілёмэтраў. Узапраўды ўсё, што жыве, пастаўлена на ногі, каб злавіць бандытаў, але гэта магчыма толькі з вялікім расходам сіл і грошай.

Пасьля розных іншых пытаньняў журналісты спытаўся:

— Ці пан міністар думае, што ўдасцца направіць адносіны на крэсах?

— Адносіны на крэсах, — адказаў міністар, — не залежаць толькі ад міністэрства ўнутраных справаў. Гэта перш за ўсё справа гаспадарчых адносін. Нам трэба грунтоўных з гэтага боку зьменаў, якія зусім перамянілі-б настрой крэсовага насяленьня.

— Зямельнай рэформы?

— Але. Аднак думаю, што яе можна замяніць камасацыяй грунтаў, уладжаньнем пытаньня аб маемасьці тых сялян, якім граніца разьдзяліла сялібы і зямлю. Балячка крэсаў—гэта справа зямлі. Апроч таго насяленьне наракае на падаткі...

Крэсовае насяленьне,—закончыў сваю гутарку міністар,—гэта добры матар'ял на добрых грамадзян. Але ёсьць і элемэнты нездаволеныя або проста падазронныя. Іхні настрой, як бачым, выкарыстоўваюць розныя лоўкія інструктары з-за граніцы...

Вынятковае палажэньне на акраінах.

У „Kur. Poran." за 1-е кастрычніка надрукована гэткая заметка:

„Даведваемся з найболей верных крыніцаў, што ў мэтах урэгуляваньня адносін публічнае бясьпечнасьці на Беларусі, ўрад замерваецца ўвясьці вынятковае палажэньне ў Палескім ваяводзтве. Гэткае разрашэньне справы ўрад лічыць за няўхільнае. Паўзьбежна маюць быць значна павялічаны кадры гранічнае варты, а таксама палепшаны способы лучнасьці паміж паліцэйскімі пастамі. Увядзеньне вынятковага палажэньня не цягне за сабою неабходнасьці назначэньня ваеннага ваяводы, хаця гэта і не зьяўляецца выключаным. Пакуль што, ўрад вядзе перагаворы з цывільнымі асобамі, кандыдатамі на пасаду палескага ваяводы.

Трэба дадаць, што Констытуцыя (арт. 124) прадбачвае ўвядзеньне вынятковых палажэньняў толькі „падчас вайны, альбо калі пагражае выбух вайны, як і ў выпадку ўнутраных разрухаў, альбо разыйшоўшыхся падрыхтовак ў характары дзяржаўнай здрады, пагражаючых констытуцыі дзяржавы, альбо бясьпечнасьці грамадзян". Дзеля таго, што вайна нам здаецца не пагражае, а бандыцкія напады, хоць-бы й ведзеныя ў шырокім маштабе, ня могуць быць абнятымі назовам „разрухаў", або „падрыхтовак у характары дзяржаўнай здрады"—дык праз гэта і ўводжаньне вынятковага палажэньня ў палескім ваяводзтве не зьяўляецца, як трэба, абаснованым.

Калі йдзе аб экзэкуцыйныя способы, дык і без вынятковага палажэньня прытарноўваюцца да учасьнікаў бандыцкіх нападаў на ўсім абшары Рэспублікі і на акраінах надзвычайныя (doraźne) суды.

Дык-жа здаецца, што не ваеннае палажэньне, але палепшаньне адміністрацыі, ўвядзеньне ў яе людзей з шырокім разуменьнем правапарадку, энэргічных і непрызнаючых прынцыпу несупраціўляньня злу будзе найлепшым antidotum проці бандытызму".

ПА СЬВЕЦЕ.

Маніфэст 2-га інтэрнацыяналу.

Другі інтэрнацыянал, з прычыны 60-х угодкаў яго заснаваньня, апублікаваў у канцы мінулага верасьня месяца маніфэст, у якім паказваецца на тое, што ў шмат якіх краёх удалося дасягнуць скарочаньня рабочага дня. Аднак-жа барацьбу трэба вясьці далей. Ні ў адным краі рабочы рух не дабіўся сапраўднае ўлады. Кабінэты меншасьці, пабудованыя на парлямэнтарных компромісах, істнуюць у Англіі і Даніі. У Расеі ўрад меншасьці апіраецца на штыхі. Дасягнуць падтрыманьня большасьці рабочай партыі ні ў адным краі не ўдалося. Трэба йсьці да устанаўленьня дзяржаўнае ўлады на моцнай дэмакратычнай аснове, на жаданьні пераважнае большасьці людзей і ў інтарэсах тае самае большасьці. Трэба змагацца за новы дзяржаўны лад, першым лёзунгам якога павінен быць мір.

Савецкае шпігоўства.

Корэспондэнт аднае ангельскае газэты, прыбыўшы нядаўна ў Лёндан з Сав. Расеі, расказвае пра „работу" аднае харошае, маладое амэрыканкі, якая знаходзіцца на службе ў бальшавіцкага ўраду. Амэрыканка гэтая вядома пад імем Кляры Май. Яна служыць памоцніцай Ротштэйна—загадчыка аддзелам заграґічнае прэсы. Яе галоўны абавязак—шпіёнаж і сачэньне за ангельскімі й амэрыканскімі корэспондэнтамі; пры гэтым прыватная іхняя перапіска таксама пераглядаецца. Калі аднаго разу адзін ангельскі журналісты вярнуўся ў готэль, у якім ён жыў і хацеў зайсьці ў свой пакой, дык слуга прабаваў стрымаць яго, паклікаючыся на тое што згубіўся ключ ад дзьвярэй. Калі корэспондэнт усё-ж такі зайшоў у свой пакой, дык застаў там Кляру Май разам з некалькімі жанчынамі; яны перабіралі яго паперы. Але прыватныя пісьмы выпадкова былі ў кішані ў журналістага і вобыск ня даў ніякіх рэзультатаў.

Дзеяльнасьць бальшавікоў зусім не згаджаецца з прынцыпамі, аб якіх кажуць соцыялісты ўсяго сьвету. Бязумоўна, што капіталізм у гэтай форме, ў якой ён цяпер пануе, ня можа і не павінен утрымацца, дзеля таго, што часта ён зьяўляецца падпорай крыўды і трымае рабочых у бядзе, а таксама бывае прычынай дарагоўлі. Дык значная частка вытворчасьці павінна перайсьці ў грамадзкія рукі, а рабочы за сваю працу павінен ня толькі адтрымліваць адпаведную плату, але таксама й мець учасьце ў даходах таго прадпрыемства, ў якім працуець.

Соцыялістыя кажуць, што шляхам паступовай эвалюцыі перайсьці ад цяперашняй арганізацыі капіталістычнай прамысловасьці да наладжаньня грамадзкай прамысловасьці нельга. Бэльгійскі вучоны Вандэрвэльд шырока разьвівае гэту тэму. Ён кажа, што праз нейкі час капітал, гуртуючыся ў руках вялікіх супалак, г. наз. трэстаў, гэтак сарганізуе прамысловую вытворчасьць, што яна абыйме найважнейшыя рэчы штодзеннай патрэбы ў форме вялізных прадпрыемстваў, якія будуць абслуждваць увесь сьвет. І тады толькі трэба будзе, каб дзяржава ўзяла ў свае рукі капітал гэтых вялікіх супалак і перавярнула іх у грамадзкія прадпрыемствы, і, вось, будзе зроблена *соцыялізацыя*.

Дык-жа ўжо цяпер некаторыя галіны жыцьця перайшлі на грамадзкі лад. Напр. суды, школы, а ў некаторых дзяржавах чугунка і почта. Некаторыя дзяржавы ўзялі на сябе розныя манаполі, як напр. табачны, сьпіртавы, і адтрымоўваюць ад іх вялізныя даходы на дзяржаўныя патрэбы.

Мы думаем, што мэтай сучасных грамадзянстваў перш-на-перш павінна быць вызваленьне ад крыўднай эксплёатацыі тых галін прамысловасьці і гандлю, якія даюць людзям найпатрэбнейшыя рэчы. Да гэткіх належаць: хлеб, соль, апал, мяса, адзежа і г. п. Здаволеньне гэтых самых неабходных патрэб павінна рабіцца гэтак, каб цана гэтых рэчаў была найніжэйшая, каб імі не спэкулявалі. На самых патрэбных для жыцьця рэчах ніхто не павінен зарабляць. Кошт іх гэтак трэба аблічаць, каб ён пакрываў кошт працы, дастаўкі і аддачы да агульнага карыстаньня, а даходаў ад гэтага зусім не павінна быць, або яны павінны быць надта невялічкія дый то ня ў кішаню капіталістых, але павінны ісьці ў дзяржаўную касу. Кожны грамадзянін мае права танна пражыць.

Зусім інакшая справа, калі хто купляе рэчы роскашы напр. шоўк, самаходы, дарагія шубы, залатыя рэчы і г. д. Хто мае гэтулькі грошай, каб купляць гэта, той можа плаціць навет і дарагую цану. Гэта нікому не прынясе ніякае страты, а дзяржава і рабочыя, якія іх вытвараюць, павінны карыстацца даходамі ад прадажы.

На гатунак вытвараўшагася тавару мае таксама ўплыў вольная конкурэнцыя. У бальшавіцкай дзяржаве вольнай конкурэнцыі няма. А дык-жа дасьведчаньне вучыць, што калі напр. дзьве фабрыкі выробляюць аднолькавы тавар і хочуць яго прадаць як мага больш, дык кожная з іх будзе старацца, каб тавар быў ня толькі найлепшы, але й найтаньнейшы. Дзеля таго, што кожная з іх разумее, што толькі добрым і танным таварам паб'е свайго конкурэнта. Гэтым карыстаецца пакупшчык: ён за свае грошы адтрымоўвае добры і танны тавар. Пазбаўляць прамысловасьць гэтай панукі, гэта значыць устрымоўваць яе разьвіцьцё. Фабрыка ня толькі стараецца даваць добры і танны тавар, але яна стараецца паляпшаць сваю вытворчасьць. І вось тут адчыняецца шырокі шлях выдумак і палепшаньняў, якія могуць стварыцца ў гэтакіх варунках. Конкурэнцыя піхае людзей да духоўнага высілку, да інтэнсыўнай працы, да шуканьня новых шляхоў, на якіх можна палепшыць тое, што ўжо ёсьць.

(Працяг будзе).

Крытыка камунізму ў Чэхаславацкім парлямэнце.

Бэрлінская газэта „Руль" піша аб выступленьні ў чэхаславацкім парлямэнце аднаго з дэпутатаў д-ра С. Падчас разгляду законапроекту аб соцыяльным страхаваньні камуністыя ахарактарызавалі гэты законапроект, як імкненьне ашукаць рабочых і адцягнуць іхнюю ўвагу ад клясавай барацьбы. Камуністычная крытыка зьмусіла дакладчыка бюд'жэтнае камісіі д-ра С. выступіць з вялікай прамовай, ў якой ён востра скрытыкаваў камуністых.

— Вы думаеце,—сказаў д-р С., — што мы баімося камуністых? Нашыя рабочыя—пісьменныя і знаёмыя з „заваяваньнямі", якіх дабілася камуністычна партыя для расейскіх працаўнікоў... Камуністых у Чэхаславакіі ніхто не баіцца і ня будзе баяцца.

Дэпутат Крэйбіх (камуністы),—казаў — далей д-р С., заявіў, што там, дзе пры ўладзе знаходзіцца рабочая кляса, як у Расеі, напрыклад, мэтаю соцыяльнай палітыкі зьяўляецца узмацненьне эканамічнае і палітычнае пазыцыі рабочае клясы. Ці-ж верыць хто-нібудзь з вас у гэту дэмагогію? Ніхто! У Расеі ўмацоўваецца не пазыцыя рабочых, а пазыцыя камуністычных дыктатараў, жывучых жыцьцём, якім ня жылі ніякія монархі, ў той час, як народ гіне з голаду. Паміж намі й Расеяй ёсьць розьніца. Розьніца ў тым, што ў нас парадак падтрымліваецца паліцыяй, а ў Расеі, ў выпадку народнага абурэньня, выклікаюцца кулямёты. У нас робіцца соцыяльныя рэформы, а ў Расеі ўводзіцца рабства. І цераз сто гадоў расейскія рабочыя не дасягнуць таго, што маюць нашыя рабочыя ў цяперашні час!

Занапад камунізму.

„New Jork Times" публікуе статыстычныя ведамасьці аб распаўсюджаньні камунізму ў розных краёх сьвету. Ведамасьці, трапіўшыя ў газэту, узятыя з савецкіх крыніц. Яны сьведчаць аб паніжэньні ліку камуністаў у большасьці заходнеэўропэйскіх дзяржаваў. Уплыў на рабочыя масы камуністы маюць толькі ў Нямеччыне, Чэхаславакіі і Францыі. У Бэльгіі ў 1920 г. да камуністычнае партыі належала 1000 чалавек, у 1924 годзе — 590 чалавек. У Англіі ў 1920 годзе камуністычная партыя налічвала 200.000 чалавек. У цяперашні час у ёй лічыцца ўсяго толькі 3000 сяброў. У Францыі ўвесь лік камуністаў спаў са 130.000 чалавек да 50.000. У Італіі ў цяперашні час ёсьць 12.000 камуністаў, тады як у 1920 г. было 70.000. У Нарвэгіі і Швэцыі—112.000, у 1920 годзе было 80.000. У Чэхаславакіі камуністаў налічваецца 130.000, а ў 1920 годзе было—280.000.

У С.С.Р.Р.

Расстрэлы ў Грузіі.

З Масквы праз Рыгу адтрыманы весткі, што грузінская Чэ-Ка распраўляецца масавымі расстрэламі з паўстанцамі. Паказаньні салдатаў, якія нясуць вартавую службу пры гэтай Ч. К. пацьвярджаюць факты масавых расстрэляньняў асобаў, западозраных у паўстанскім руху. Расстрэльваюцца цэлыя групы сялян, рабочых і інтэлігэнцыі бяз ніякага сьледзтва. У Манглісе апошнім часам расстрэлена 168 чалавек, у Тыфлісе 16. Спэцыяльныя аддзелы ГПУ ужо трэці раз зьменены. У Душэце застрэліўся сябар выканаўчага камітэту камуністы Георгідзэ, вёўшы сьледства па справах устанаўленьня надужыцьця ўлады чэкістымі пры ліквідацыі паўстаньня. Самагубства Георгідзэ адбылося ў рэзультаце абурэньня яго проці бясьсільля сьледчае камісіі ў сэнсе падтрыманьня чэкістых да адпавядальнасьці за зьдзек і катаваньне самым гнюсным спосабам арыштаваных і нічым нявытлумачанае расстрэльваньне сялянства.

Новыя спосабы.

Савецкія газэты дадумаліся да новага спосабу памагаць працы ОГПУ. Яны перадрукоўваюць на сваіх шпальтах, адтрыманыя ад ОГПУ пэрлюстрованыя пісьмы грамадзян, калі ў пісьмах гэтых ёсьць няпрыемныя ўвагі аб радавай уладзе і камуністычнай партыі. Чалавек, пісьмо якога трапляе, гэткім чынам, у газэты, робіцца у С.С.Р.Р. адщчапенцам, з якім небясьпечна мець дачыненьне.

Прыклад у друкаваньні гэткіх пісьмаў падала **менская** „Звезда", якой міліцыя перадала пук пісьмаў, захопленых падчас вобыску ў мясцовага духавенства.

Паўстанчы рух.

Паводлуг вестак з Смаленску, на места Сычоўку быў зроблены налёт паўстанцаў, якія ў ліку некалькіх сот чалавек раптоўна напалі на места і захапілі ўрадовыя будынкі. Яны прабавалі падарваць мост на чугунцы, але гэта ім не ўдалося. Надыйшоўшыя з Вязьмы і Ржэва аддзелы чырвонае арміі выбілі паўстанцаў з места. Аднак-жа, ў павеце паўстанцы ўсё яшчэ даюць сябе адчуваць.

Гураган у Пскове.

Уночы на 23 верасьня над Псковам праляцеў гураган саўсім над'звычайнае сілы Гураган прайшоў з захаду з страшэннай навальніцаю і грымотамі. Лік маланак быў гэтак вялікі, што ў працягу гадзіны места бесьперарыўна асьвятлялася нібы моцнай электрычнасьцю. Навальніца нябывалае сілы цягнулася пяць мінут. Гураганам садраны з дамоў стрэхі, павысаджваны брамы, вывернены тэлеграфныя стаўпы.

Паводка ў Петраградзе.

Быўшая ў Петраградзе паводка нарабіла страшэнныя шкоды. Яна не пашкадавала й гістарычных памятнікаў. У Расейскім музэі былі заліты вадою 28 заляў і ўсе падвалы. У вадзе апынуліся 28 скрынак з абразамі, зброяй, дыванамі і інш. Шмат якія з затопленых рэчаў удалося выцягнуць з вады, але значная часьць так і засталася ў вадзе.

У Пэтэргофе ў палацах вада стаяла у ніжніх паверхах больш-менш на аршын увышкі. Папсованы мэблі.

Натуральным пасьледзтвам паводкі зьявіўся рост хваробаў. Пашыраецца брушны тыфус, запаленьне лёгкіх, бронхіт. Лік захварэньняў даходзіць да 100 ў дзень.

Паводка нарабіла руйнацыі й на чугунках петраградскага вузла. Чугуначная лінія ад Новай-Дзярэўні да Сестрарэцку на працягу 8 вёрст адведзена ў бок на 250 сажняў. Лінія Пушчыно-Новы Порт саўсім разбурана.

Жыцьце провінцыі.

Друя, *Дзісьненскага пав.*

Корэспандэнт „Dzien. Wil." м. ін піша ў сваіх пісьмах з Друі гэтак:

. . Ад пагранічнай паліцыі чалавек павінен спадзявацца абароны ад вора, але няма ніякае абароны, дзеля таго, што паліцыянты, ідучы на пастарунак лічаць сваім абавязкам браць з сабой бутэльку гарэлкі і навет дамагаюцца гарэлкі ў прыватных дамох, якія нічога супольнага з карчмой не маюць. Удзень няраз п'яныя паліцыянты ўрываюцца ў прыватныя кватэры і кажуць, што хочуць сабе адпачыць (?!), а калі гаспадары хочуць іх выкінуць, дык кажуць: „ты ведаеш з кім маеш справу? — я паліцыянт!" А калі гаспадар ідзе скардзіцца да камандзера, асьпіранта Швігера, дык пан асьпірант адказвае: „трудна даць раду, дзеля таго, што ў мяне людзі сабраны з усяго сьвету?"

М. Сіняўка, *Нясьвіскі пав.*

Апошнімі днямі сяляне нашае вёскі заўважылі, што нехта крадзе ў іх куры і гусі. Аж, нарэшце, адзін з гаспадароў дапільнаваў гэтых зладзеяў. Уначы ён, пачуўшы крык гусей, выглянуў праз вакно і ўбачыў, што са двара яго выходзяць два жаўнеры, адзін з якіх трымае пад пахай яго гуся. Выбягшы з хаты, гаспадар кінуўся да жаўнераў, каб адабраць свайго гуся, але тыя пачалі яго біць і пабілі так моцна, што ён страціў прытомнасьць. Зараз-жа гаспадара гэтага адвязьлі ў бальніцу, гдзе яму была зроблена перавязка і выдана пасьведчаньне аб адтрыманых ранах. На другі дзень жаўнеры-грабежнікі былі апазнаны па крыві на адзежы і арыштованы. Як аказалася, гэта былі якраз тыя самыя жаўнеры мясцовага гарнізону, якія былі вызначаны ў гэтую ноч у патрулі.

Цяпер толькі ў нас зразумелі, чаму гэтыя патрулі ў апошнія дні, хадзілі па хатах і нават а 8 гадзіне загадвалі гасіць агні. Як відаць, рабілі яны гэтае дзеля таго, каб лепей было красьці.

А—ч.

Віленска-Троцкі пав.

25 верасьня ўночы ў засьценку Пікуцішкі, Рашанскай вол., з невядомай прычыны пачаўся пажар. Згарэлі: дом, хлявы і пуні Браніслава Сянкевіча Страты каля 1½ тыс. зл.

Рудомінская вол.

27 верасьня ў фальварку Рада, Рудомінскай вол., у Я. Купрашэвіча ад неасьцярожнага абходжаньня з вагнём пачаўся пажар, у часе якога згарэлі ўсе будынкі. У хаце ў час пажару нікога ня было (ўсе былі ў полі) апрача 7 месячнага дзіцяці, якое абгарэла і ў працягу 4-х гадзін памёрла Страты дасягаюць да 8 х тыс. зл.

Тутэйшая хроніка.

— **Беларускі Юрыдычны Аддзел.** Пры часовай Беларускай Радзе істнуе Юрыдычны аддзел, які дае ўсялякую юрыдычную помач. Прыём кліентаў штодня, апрача сьвятаў, ад 10—12 гадз. ўдзень.

— **Стары стыль.** Ува ўсіх праваслаўных віленскіх цэрквах пастаноўлена адпраўляць службы ў сьвяты паводлуг старога стылю.

— **Аўтобусы.** З 2-га гэтага кастрычніка ў Вільні пачаўся рух аўтобусаў. Спачатку будзе курсаваць толькі адна лінія Вакзал — Зьвярынец. Пакуль што, ходзяць 3 самаходы італьянскае фірмы „Fiat". Кожны з іх разьлічаны на 16 пасажыраў. Чародная лінія адкрыецца тыдні цераз два. Плата — 20 грошай за 2 кілёмэтры, за кожны далатковы кілёмэтр бяруць 10 грошай. Для вучняў і вайсковых 30 проц. скідкі. Усяго ў Вільні проектуецца пусьціць у рух каля 16—18 машынаў. Рух будзе адбывацца ад 7 гадзіны раніцы да 11 гадз. ўвечары.

Нарэшце мусі віленскае жыхарства ня будзе мець патрэбы скардзіцца на апэтыты нашых звозчыкаў.

— **Забастоўка.** З 2 га кастрычніка пачалася забастоўка аркестравых музыкантаў, якія граюць у рэстаранах. Яны трэбуюць падвышэньня платы ад 15 да 45 процантаў. Рэстаратары катэгорычна адкінулі гэтае трэбаваньне.

— **Лік безработных.** Урадовае бюро па рэестрацыі безработных на 2-е кастрычніка занатавала ў Вільні 1219 бэзработных, з якіх 362 жанчыны.

— **Курс золата.** Міністрам Скарбу курс 1 грама чыстага золата устаноўлены ў 3 злот. 45,24 грош.

Усячына.

Заморскія мурашкі.

Як піша „Kur. Por." за 3 гэтага кастрычніка, спэцыяльная камісія, зложаная з прадстаўнікоў мігратцкіх аддзелаў: тэхнічнага і здароўя, а таксама загадчыкаў дэзынфэкцыйнага закладу і хімічнае працоўні зрабіла агляд аднаго дому на вуліцы Эміліі Плятэр у Варшаве. У падворку гэтага дому месьціцца будынак, ў зьвязках страхі якога разьвяліся мурашкі. Мурашкі нішчаць гэтыя зьвязкі і ужо нарабілі дзіраў у бэльках, пагражаючы абвалам дому. Ня гледзячы на зробленыя фабрыкаю захады (серка, мыш'як і г. д.) мурашак вынішчыць не ўдалося. З прычыны магчымага пераходу мурашак да суседніх будынкаў, камісія была паклікана дзеля прыняцьця радыкальных спосабаў. Экзэмпляры шкоднікаў пасланы ў Дзяржаўн. Гігіенічную Установу, а таксама да спэцыяліста зоолёга прафэсара Макржэцкага з мэтай акрасьленьня гатунку мурашак і паданьня спосабу, як іх вынішчыць.

Мурашкі гэтыя, — як здаецца варшаўскай газэце, — тропічнага паходжаньня і былі закінены ў Варшаву разам з таварамі з Гданску!

Волаты

У даўнейшыя часы, а навет колькісот гадоў назад, здараліся на сьвеце вялізныя волаты, з якіх найвялікшы, адзін *амэрыканец* быў страхоцьцем для ўсіх тагочасных жыхароў, дзеля таго, што быў *вышынёй ажно 10 мэтраў з гакам!* Жыў ён ў XII ці XIII стагодзьдзі пасьля Хрыста; аб ім пішуць ня толькі амэрыканскія газэты але і эўропэйскія. Ягоны шкілет з чэрапам датраваны да сяньня ў даволі добрым стане. Волаты спатыкаюцца і цяперака.

З жывучых цяпер—найвялікшымі ёсьць: адзін афрыканскі нэгра (*каля 3 мэтраў*) і волат Амэрыкі (*каля 3½ мэтраў*), які ёсьць найбольшым чалавекам усяго сьвету ў сучасны момант!

Паштовая скрынка.

— **І. Дамінікоўскі, І. Ганчарык, М. Катовіч, Ю. Мілеўскі.** Грошы адтрыманы, газэту пасылаем.

— **Пышка.** Пісьмо адтрымалі, газэту высылаем.

Выдавец: Беларускае Грамадзянск. Сабраньне. Рэдактар: Язэп Салавей. Друкарня „Lux", вул. Жэлігоўскага, 1. Тэлеф. № 203.